# За далейшы ўздым навукова-даследчай работы

Днямі закончылася XIX навуковая сесія прафесарска-выкладчыцкага саставу універсітэта, прысвечаная вынікам навукова-даследчай работы за 1953 год. Сесія выявіла як поспехі, так і сур'ёзныя недахопы, якія яшчэ маюцца ў навуковай рабоце нашага калектыва.

Пяццю кафедрамі хімічнага факультэта на сесію было прадстаўлена 10 дакладаў. Сярод іх маючая вялікую навуковую каштоўнасць работа М. М. Паўлючэнкі, якая прысвечана даследаванням у галіне кінетыкі гетэрагенных хімічных рэакцый. Прафесар П. І. Бялькевіч і аспірант А. І. Верзал у рабоце «Аб прымяненні глін у ачышчэнні масел» далі фізіка-хімічную характарыстыку беларускіх глін (адсарбентаў) і выявілі найбольш каштоўныя ўзоры для мясцовай прамысловасці.

Усе прачытаныя на хімічнай секцыі даклады маюць пэўную навуковую і практычную каштоўнасць і ўкараняюцца на прамысловых прадпрыемствах Мінска.

Аднак у рабоце канферэнцыі не ўдзельнічалі прадстаўнікі заводскіх лабараторый. Гэта з'яўляецца сур'ёзным недахопам, які трэба ўлічыць пры скліканні наступнай сесіі.

14 навуковых даследаванняў у галіне тэарэтычнай і эксперыментальнай фізікі было абмеркавана на пасяджэннях фізічнай секцыі фізіка-матэматычнага факультэта.

Сярод выкананых работ асаблівай увагі заслугоўвае работа дацэнта Ф. І. Фёдарава, які паспяхова вырашыў рад прынцыповых праблем у галіне тэарэтычнай оптыкі, работы прафесара Б. І. Сцяпанава, дацэнта І. В. Фішэра, дацэнта І. Г. Некрашэвіча і другіх.

Але не ўсе выкладчыкі кафедраў вялі сістэматычную навуковую работу. Усё яшчэ існуе вялікая многатэмнасць, няма поўнага кантролю з боку кафедраў за работай сваіх навуковых супрацоўнікаў, адсутнічае сувязь з Акадэміяй навук і навуковымі ўстановамі Мінска.

Сярод лепшых работ філалагічнага факультэта неабходна адзначыць работу дацэнта А. Я. Бірала «Да пытання аб паходжанні і развіцці беларускай літаратурнай мовы». Вялікі фактычны матэрыял даклада раскрывае асноўныя заканамернасці ў развіцці беларускай літаратурнай мовы. З цікавымі дакладамі выступілі таксама дацэнты Д. Е. Фактаровіч, Ю. С. Пшыркоў, Ф. І. Куляшоў.

На пасяджэнні секцыі гістарычных навук было абмеркавана пяць дакладаў, прысвечаных гісторыі сялянства Беларусі, некаторым момантам у развіцці эканомікі савецкай Беларусі і іншым праблемам.

На заключным пасяджэнні адзначалася, што кафедрам гістарычнага факультэта неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на распрацоўку пытанняў па гісторыі СССР савецкага перыяду і навейшай гісторыі зарубежных краін, асабліва краін народнай дэмакратыі.

Важнае практычнае значэнне маюць работы прафесараў Г. Г. Вінберга, Н. А. Дарожкіна і другіх супрацоўнікаў біёлага-глебавага факультэта. Яны прысвечаны распрацоўцы метадаў інтэнсіфікацыі натуральных вадаёмаў і сажалкавых гаспадарак рэспублікі і павышэнню рыбапрадуктыўнасці, вывучэнню прычын палягання збожжавых культур на тарфяных глебах, фізіялагічнаму даследаванню буйной рагатай жывёлы Беларусі.

Падводзячы вынікі канферэнцыі, можна адзначыць, што ў 1953 годзе навукова-даследчая работа прафесарска-выкладчыцкага састава універсітэта значна палепшылася ў параўнанні з мінулымі гадамі.

Аднак, у арганізацыі навукова-даследчай работы ва універсітэце былі ўскрыты і сур'ёзныя недахопы.

У планах навуковай работы на 1953 год, як і ў мінулых гадах, была вялікая многатэмнасць. На многіх кафедрах адсутнічала пэўная акрэсленая мэтанакіраванасць у навуковай рабоце. Недастаткова поўна наладжана супрацоўніцтва вучоных універсітэта з работнікамі вытворчасці.

Ухіленне недахопаў, якія ўскрыліся на сесіі, будзе бясспрэчна садзейнічаць далейшаму ўздыму навукова-даследчай работы ва універсітэце, дапаможа нашым вучоным паспяхова выканаць задачы, пастаўленыя партыяй перад савецкай навукай.

# МОТАПРАБЕГІ ДРУЖБЫ

Цёплым красавіцкім ранкам ля будынка універсітэта ў шэраг выстраіліся дзевяць чысценькіх іжоў. Гэта студэнты-спартсмены Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна сабраліся ў свой чарговы прабег. Мы падыходзім да камандора прабега Б. Сакалова.

— На гэты раз,—гаворыць ён,— наш маршрут ляжыць праз Кіеў на Пераяслаў-Хмельніцкі, дзе 300 год назад адбыўся гістарычны акт уз'еднання Украіны з Расіяй. Мы прымем удзел ва ўрачыстасцях, якія адбудуцца там.

—Скажыце дакладней, які ваш маршрут?—пытаемся мы ў камандора.

—Наш маршрут пройдзе праз Бабруйск, Гомель, Чэрнігаў, Кіеў. Усюды на прыпынках нашы спартсмены правядуць гутаркі аб слаўнай гадавіне ўз'еднання, аб рашэннях вераснёўскага і лютаўска-сакавіцкага Пленумаў і на іншыя тэмы.

Далей нам прадоўжыць гутарку не давялося. Раздаўся грукат спачатку аднаго, затым другога і трэцяга матацыклаў. Гэта апошняя праверка машын. А ўжо праз мінуту ля матацыклаў выстраіліся і самі ўдзельнікі прабегу, якіх шчыльна абступілі праважаючыя—студэнты, выкладчыкі, адміністратыўна-гаспадарчыя работнікі універсітэта.

Чотка гучыць каманда. Спартсмены выслухоўваюць рапарт камандора аб гатоўнасці да вялікага падарожжа.

—Перадайце цёплае прывітанне ад нашага народа братняму украінскаму народу,—гаворыць рэктар універсітэта К. І. Лукашоў.— Жадаем вам шчаслівай дарогі!



* * *

Студэнты Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта ў майскія дні наладзілі мотапрабег у Маскву. І хоць Мінск заставаўся ў баку ад іх маршрута, яны ўсё-ж вырашылі завітаць да сваіх беларускіх сяброў... Гэта іх візіт у адказ на наведванне нашымі матацыклістамі Кіева ў маі мінулага года.

—За плячыма ўжо звыш поўтысячы кіламетраў. Набліжаемся да Мінска,— расказвалі нам кіеўскія спартсмены.—Якое хваляванне ахапіла кожнага з нас, калі мы здалёку ўбачылі абрысы горада. Замест руін і абвалін—велічныя светлыя будынкі, шырокія вуліцы, карпусы новых заводаў і фабрык. Прывітанне табе, узняты з папялішчаў Мінск! Мы ганарымся табою, блізкім і родным нашаму сэрцу!

Па даручэнню шматтысячнага калектыва Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта украінскія сябры перадалі нашым студэнтам першамайскія віншаванні і запрасілі іх на ўрачыстасці ў Кіеў, на вялікае свята дружбы савецкіх народаў.



Тэкст і фота Р. ЯСІНСКАГА, Б. БРЭЙВО

## ДА ЎВАГІ ФОТААМАТАРАЎ

Аб'яўляецца конкурс на лепшы фотаздымак. На конкурс прымаюцца каляровыя і звычайныя фотаздымкі самых разнастайных жанраў: партрэтныя, пейзажныя, вытворчыя і г. д.

Пасля падвядзення вынікаў агляду лепшыя фотаздымкі будуць узнагароджаны граматамі і змешчаны ў нашай газеце.

Фотаздымкі на конкурс прадстаўляюцца ў рэдакцыю газеты «За сталінскія кадры» да 1 чэрвеня 1954 года.

З ТВОРАЎ, ДАСЛАНЫХ НА КОНКУРС

## БАЛЛАДА О ДВУХ КИРПИЧАХ

А. ХАРКЕВИЧ

*Их привезли минчанам*
*Сталинградцы*
*В знак дружбы*
*Сталинградцев и минчан*
*—два*
*политые кровью*
*братских наций,*
*два*
*обыкновенных*
*кирпича.*
*Они—*
*как символ подвига—*
*остались*
*следами страшных ран*
*испещрены.*
*На них—*
*сама история писалась*
*осколками*
*и пулями*
*войны!*
*... Враги сжимали*
*грозными клещами*
*кварталы города—*
*за домом дом.*
*Минчанин,*
*сталинградец,*
*киевлянин*
*стояли насмерть*
*в доме*
*угловом.*
*Четвёртый месяц—*
*пламя...*
*бомбы...*
*мины...*
*Четвёртый месяц—*
*грохот...*
*скрежет...*
*дым...*
*Уже от дома—*
*лишь одни руины,*
*но он—*
*попрежнему*
*несокрушим!*
*И вот*
*осталось только три*
*гранаты...*
*Фашисты танками*
*прорвали фланг...*
*И обнялись*
*в последний раз*
*солдаты,*
*по одному*
*ложась*
*под танк...*
*„Спокойно спите,*
*верные солдаты“,—*
*им тихо шепчут ветры*
*по ночам.*
*А кровь друзей—*
*героев Сталинграда—*
*цвет отдала свой*
*алый*
*кирпичам.*
*„Ваш подвиг свят,*
*бессмертные солдаты“,—*
*грохочет поезд,*
*по мостам стуча.*
*Везёт он в Минск*
*подарок Сталинграда—*
*два*
*политые кровью*
*кирпича.*
*И каменщик*
*в одну из новостроек*
*замуровал их, сохранив*
*векам,*
*как памятник*
*товарищам-героям*
*и как—*
*предупреждение*
*врагам!*

## Корнет лейб-гвардии

В. ТАРАС

I

*Жандарм императорской стражи*
*Вручил высочайший указ:*
*Предписано ехать сейчас же*
*В Гродненский полк,*
*На Кавказ...*

*Еще далеко до рассвета.*
*Седая позёмка метёт.*
*Летит по сугробам карета*
*Четвертую ночь напролет...*

*Россия! Родная Россия...*
*Село на крутом берегу.*
*На склонах берёзы босые*
*Стоят по колено в снегу...*

*И снится, как в замети мглистой,*
*Сквозь эту пустынную ширь,*
*Прошли в кандалах декабристы*
*Этапом в глухую Сибирь.*

*И снится под пенье метели*
*Та страшная ночь января:*
*Пушкин убит на дуэли*
*Безродным наймитом царя...*

*Россия! Родная Россия...*
*Застава на стыке дорог...*
*—Что, барин, наверно впервые*
*На лютом морозе продрог?*

*Что можно на это ответить?*
*И вряд ли фельдъегерь поймет,*
*Что в душном завистливом свете*
*Душа превращается в лёд!*

II

*Уже по глубокому снегу,*
*Усталые кони сдают,*
*Дорогу ругает фельдъегерь,*
*И службу, и долю свою...*

*Корнет усмехнулся печально:*
*—Вот она—наша судьба!*
*Мятежник, невольник опальный*
*Едет под стражей раба!*

*В шинелишке зябко корнету.*
*Мороз-то уж больно здоров.*
*И вьюга лютует, и нету*
*Вблизи постоялых дворов...*

*И ветром жестоким пронизан,*
*Он грустно жандарму сказал:*
*Россию от верха до низа*
*Невиданный холод сковал...*

*В заснеженном поле безбрежном*
*Малейшего проблеска нет...*
*И только лишь сердцем мятежным*
*Угадан грядущий рассвет.*

III

*... Зябко в армейской шинели.*
*Дорога ещё далека.*
*Еще далеко до дуэли.*
*Мартынов—приятель пока...*

*И Лермонтов дремлет в карете,*
*Не чувствуя близкой беды...*
*А яростно воющий ветер*
*Снегами заносит следы,—*

*Чтоб не было их и в помине...*
*Но их—не сотрут и года:*
*На русской бескрайней равнине*
*Остались они навсегда.*

1952—54 гг.

## ЗА ЧЫСТАТУ Ў ІНТЭРНАТАХ

Штогод у дні традыцыйных свят савецкага народа лепшыя пакоі студэнцкіх інтэрнатаў універсітэта ўзнагароджваюцца каштоўнымі падарункамі. Нядаўна жыллёва-бытавая камісія прафкома праверыла санітарнае становішча пакояў. Яна ўстанавіла, што лепш за ўсё справа абстаіць у інтэрнаце ў хімічным корпусе і па вуліцы Няміга. Шэраг пакояў гэтых інтэрнатаў атрымаюць падарункі.

Камісія ўстанавіла таксама, што ў інтэрнатах па вул. Свердлова і Маскоўскай яўна трывожнае становішча. Асаблівай неахайнасцю вызначаюцца студэнты старэйшых курсаў і аспіранты. Слоем пылу і бруду пакрыўся пакой № 96 (вуліца Свердлова), дзе жывуць студэнты В. Міхайлаў, Э. Сушкевіч і другія. Падлога тут не падмятаецца па некалькі тыдняў, вокны не праціраюцца. Не лепш і ў жыхароў пакояў №№ 102, 114, 119, 138, 139.

Студэнты гістарычнага факультэта, якія жывуць у пакоі № 127 (староста т. Рубіс), прыбеглі да вы прабаванага прыёму. Пры набліжэнні камісіі яны выслалі «парламенцёра». Пакуль той угаварваў прадстаўнікоў прафкома пагуляць па калідоры, у пакоі ішла ліхаманкавая ўборка: папраўляліся скамячаныя пасцелі, выціраўся пыл, простынямі разганяўся табачны дым. Нарэшце, убачыўшы, што камісія не паддаецца ні на якія ўгаворы, «парламенцёр» знік у пакоі і замкнуў дзверы на ключ.

Жорсткую барацьбу вытрымала камісія, пакуль здолела папасці ў пакой № 5, дзе жывуць аспіранты. Тав. Ражкоў, які сапраўды храбра змагаўся з прадстаўнікамі прафкома, сустрэў іх лаянкай і заявіў:

— Трэба ведаць, куды хадзіць.

Як гаворыцца, тут каментарыі залішнія. Зазнайства і грубасць не робяць чэсці і другім аспірантам.

Вынікі абследавання паказалі, што санітарнае становішча універсітэцкіх інтэрнатаў увогуле яшчэ нізкае. Многія студэнты зусім забываюцца аб правілах соцыялістычнага агульнажыцця, аб тым, колькі сродкаў траціць дзяржава на добраўпарадкаванне студэнцкіх інтэрнатаў.

Да сораму жыллёва-бытавой камісіі прафкома і яе старшыні т. Будзвея патрэбна сказаць, што камісія цікавіцца санітарным становішчам ад выпадку да выпадку і толькі тады, калі патрэбна ўручыць падарункі, не гаворачы ўжо аб тым, што іншымі пытаннямі яна зусім не займаецца. Камітэту комсамола і прафкому неабходна пракантраляваць работу жыллёва-бытавой камісіі і прыняць неабходныя меры да неахайных студэнтаў і аспірантаў.

**А. НЭЛІНА.**

*Мал. Э. КАЛЯДЭНКІ*




**Аднаму работа—кара.**
**Ён сагнуўся ад нуды,**
**Бы яму ляглі на карак**
**Велізарныя пуды!**

**А гэты—працаваў з ахвотай.**
**Зірні хутчэй на рабацягу:**
**Яго дыпломная работа**
**На самай справе мае вагу!**

## Прыязджайце да нас

*У навуковай студэнцкай канферэнцыі хімічнага факультэта, якая праходзіла 26—27 красавіка, прынялі ўдзел студэнты хімічнага факультэта Вільнюскага дзяржаўнага універсітэта І. Бубяліс, І. Папільскіс, Л. Сімановічус. Госці прачыталі свае даклады на канферэнцыі, пабывалі на аўтамабільным заводзе, азнаёміліся з Мінскам.*

*Кіраўнік дэлегацыі І. Бубяліс падзяліўся сваімі ўражаннямі аб паездцы на старонках газеты „Советский химик". Змяшчаем яго пісьмо.*

У гэтым годзе нам пашчаслівілася пабываць на Вашай навуковай канферэнцыі, дзе былі прадстаўлены лепшыя работы 1953 года.

Вынікі сесіі паказалі, што маюцца ўсе магчымасці для далейшага роста СНТ хімфака БДУ. Для гэтага як грамадскім арганізацыям, так і студэнтам трэба толькі ўдзяліць больш увагі даследчай рабоце.

У час свайго прабывання ў сталіцы брацкай рэспублікі мы пазнаёміліся з факультэтам і славутасцямі горада. Дзе-б мы ні былі: у горадзе ці ў інтэрнаце, на факультэце ці на заводзе—усюды мы адчувалі клопаты сяброў.

За ўсё гэта сардэчнае дзякуй!

Мы спадзяемся, што ў наступным годзе Вы абавязкова прыедзеце да нас у Вільнюс.

**І. БУБЯЛІС,**
**старшыня совета СНТ хімфака ВДУ.**

### Навуковая нарада

З 10 мая 1954 года ў нашым універсітэце пачнецца нарада па пытаннях вывучэння вадаёмаў Беларускага Палесся. На канферэнцыі будуць прысутнічаць госці з Акадэміі навук і універсітэтаў Літвы, Украіны. Многія з іх падзеляцца вопытам па вывучэнню вадаёмаў і азёр.

Нарада прадоўжыцца да 12 мая. За гэты перыяд будзе заслухана і абмеркавана больш 20 дакладаў.

*ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ*

## НА БАСКЕТБОЛЬНАЙ ПЛЯЦОЎЦЫ

Закончыліся апошнія прыгатаванні. З трох бакоў пляцоўка абнесена сеткавай рашоткай, устаноўлены і замацаваны шчыты, лініямі размечана пляцоўка. Збылася мара баскетбалістаў: доўгачаканая летняя пляцоўка гатова.

Як прыемна пасля трэніровак у невялікім закрытым памяшканні выйсці на прастор, на свежае паветра. Вялікая, зручная, яна прыцягвае да сябе шмат спартсменаў і «балельшчыкаў».

27 красавіка на новай пляцоўцы пачаўся разыгрыш першынства універсітэта па баскетболу сярод мужчынскіх каманд. Каманда баскетбалістаў філалагічнага факультэта з вялікім лікам выйграла сустрэчу ў баскетбалістаў хімічнага факультэта. Баскетбалісты аддзялення журналістыкі перамаглі каманду філфака. У сустрэчы каманд геафака і філфака перамогу атрымалі баскетбалісты геолага-геаграфічнага факультэта. Без паражэння пакуль ідуць дзве мацнейшыя баскетбольныя каманды гістарычнага і геолага-геаграфічнага факультэтаў. З першых іграў гэтыя каманды паказалі сваю добрую падрыхтаванасць, сыгранасць. На пляцоўцы яны адчуваюць сябе ўпэўнена.

А вось баскетбалістам біёлага-глебавага факультэта, пэўна, новая пляцоўка не спадабаецца, і, магчыма, таму яны і не з'явіліся ні на адну з іграў. За тры няяўкі каманда гэтага факультэта знята са спаборніцтваў.

Днямі розыгрыш першынства заканчваецца. Да рэгулярных трэніровак прыступяць зборныя мужчынская і жаночая баскетбольныя каманды.

У хуткім часе будуць закончаны недаробкі: вышэй узнімецца рашотка на ліцавых баках пляцоўкі, будуць пабудаваны раздзявалка і лаўкі для гледачоў.



На здымку: момант ігры каманд геолага-геаграфічнага і філалагічнага факультэтаў.

## Першынство по стралковаму спорту

Падведзены вынікі стралковых спаборніцтваў, якія праводзіліся ў гонар Міжнароднага свята працоўных 1 Мая і Свята Перамогі. У ходзе спаборніцтваў агульнае першае каманднае месца заняла каманда геолага-геаграфічнага факультэта, якая набрала 6 балаў. На другім месцы—каманда хімічнага факультэта, на трэцім — біёлага-глебавага.

У выніку спаборніцтваў 6 удзельнікаў выканалі нормы другога разраду, 54—трэцяга. Лепшы вынік у мужчын паказаў аспірант хімічнага факультэта В. Сташонак, які выбіў 100 ачкоў з 100 магчымых. У жанчын у практыкаванні № 14 (лежачы) на першае месца з рэзультатам 97 ачкоў вышла І. Еменская (хімфак).

У практыкаванні па стандарту І месца заняла каманда фізіка-матэматычнага факультэта, якая выступала ў складзе В. Іванова, Г. Бычэнка, Р. Жбанкова, І. Загорскай і С. Лешчынскай. У практыкаванні № 14 (лежачы) першае месца—у студэнтаў хімічнага факультэта.

Па абаронна-масавай рабоце на першае месца вышаў хімічны факультэт, якому прысуджан пераходны кубак універсітэта.

## ЯЕ НАЗЫВАЮЦЬ „МАДАМ"

«Мадам» — назва манчэстэрскай лічыльнай машыны—вядома большасці людзей як электронны мозг. Гэтая машына, якая ўстаноўлена ў спецыяльным будынку для электронных лічыльнікаў, здольна іграць у шашкі і шахматы, а таксама рабіць звычайныя матэматычныя вылічэнні. Ці праўда гэта? І калі так, то як гэта адбываецца?

Перш за ўсё трэба сказаць, стварэнне такой машыны стала магчымым дзякуючы вынайдзенай прафесарам Уільямсам «машыне памяці», электронна-прамянёвай трубцы.

«Мадам» складаецца з васьмі «трубак памяці», кожная з якіх «помніць» у працэсе вылічэння больш тысячы адназначных лікаў. Акрамя таго, у ёй ёсць магнітная «кладоўка», якая захоўвае на працягу любога часу такі велізарны лік цыфраў, што думцы не пад сілу ўявіць усе гэтыя лічбы.

Матэматычныя вылічэнні робяцца выключна хутка. Косінус вугла можа быць вылічан (з дакладнасцю да адной мільярднай) за адну васьмісотую долю секунды.

Вылічэнні, якія занялі-б у чалавека, які працуе на звычайнай лічыльнай машыне, цэлы дзень, могуць быць выкананы пры дапамозе гэтага лічыльнага апарата за дзве мінуты.

Працэс работы пачынаецца з таго, што ў машыну падаецца перфараваная лента літаразапісваючага апарата, на якой ва ўмоўных абазначэннях запісана заданне. Адказы можна атрымаць на той-жа перфараванай ленце, або яны могуць быць надрукаваныя на паперы.

### Бязлітасны праціўнік

Гэта праўда, што машына можа іграць у шашкі з чалавекам. Для гэтага падрыхтоўваюць спецыяльнае кіраўніцтва, якое мае правілы ігры, што запісаны на перфараванай ленце. Затым «Мадам» просіць іграючага кінуць жрэбі з тым, каб высветліць, хто пачынае ігру, і крыху пачакаўшы, пытае: «Я пачынаю?» Ігра пачынаецца, але варта чалавеку падумаць над якім-небудзь ходам больш трыццаці секунд, як голас з рэпрадуктара падгоніць яго. А калі партнёр затрымаецца на мінуту, машына патрабуе, каб ён лічыў сябе пераможаным. Машына можа нават іранізаваць над праціўнікамі. Калі няўдалы партнёр зробіць няправільны ход, «Мадам» патрабуе, каб ён прачытаў кіраўніцтва да ігры. Партнёр прыходзіць у абурэнне і робіць другі няправільны ход. Машына спакойна гаворыць: «Вы зрабілі яшчэ адзін няправільны ход. Калі вы будзеце памыляцца, я не буду з вамі іграць». І калі партнёр, стаміўшыся весці ігру, якую ён не можа выйграць, робіць памылкі ў трэці раз, «Мадам» гаворыць яму, каб ён ішоў іграць з кім-небудзь другім.

Між тым партнёр не можа выйграць. Калі ён нават дастаткова ўмелы, каб паставіць машыну ў такое становішча, калі для яе застаецца толькі адзін ход, «Мадам» проста адмаўляецца хадзіць і канчае ігру. Вядома, гэта не адпавядае правілам. і можна колькі хочаш абурацца «неспартыўнай выхадкай» «Мадам», але-ж гэта машына...

Магчымасці «Мадам» амаль бязмежныя. Яна рашала шахматныя эцюды, яе застаўлялі напяваць мелодыі. «Мадам» нястомная, яна працуе 24 гадзіны ў суткі, робячы разлікі для універсітэта, міністэрства забеспячэння і многіх іншых арганізацый, якім патрабуюцца складаныя працаёмкія вылічэнні. У машыны заўсёды дзяжураць тэхнік і інжынер, якія працуюць пазменна.

**(«Всемирные студенческие новости» № 1 1954 г.)**

## ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

### «Гэта не дробязі»

Фельетон пад такой назвай быў апублікаван у нашай газеце 7 красавіка 1954 года. Факты, прыведзеныя ў ім, абмяркоўваліся на пасяджэнні жыллёва-бытавой камісіі прафкома.

Камісія ўказала на бяздзейнасць стараст пакояў №№ 115, 120 тт. Стаскевіча, Пінчук, пастанавіла папярэдзіць тт. Рыбака (І філфак), Эрдмана (І хімфак) і хадайнічаць перад рэктаратам аб вынясенні вымовы тт. Цішчуку і Самсону (IV фізмат).

Прафком абавязаў студсовет інтэрната больш уважліва сачыць за парадкам у пакоях, быць больш патрабавальным да стараст.

### «Бурсацкія норавы»

На тым-жа пасяджэнні быў абмеркаван фельетон «Бурсацкія норавы», змешчаны ў газеце «За сталінскія кадры» 18 сакавіка 1954 г. Факты прызнаны правільнымі. Прафком узбуджае хадайніцтва перад рэктаратам аб выключэнні з інтэрната студэнта Б. Савіцкага (II філфак) за парушэнне вучэбнай дысцыпліны, за п'янства, хуліганства і недастойныя паводзіны ў быце.

Што датычыцца студэнтаў Вашкевіча, Кандыбы, Уварава, то прафком абмежаваўся абмеркаваннем іх учынкаў.

### «У запале крытыканства»

Пад такім загалоўкам у газеце «За сталінскія кадры» № 5 (191) ад 18 сакавіка гэтага года была змешчана заметка, у якой указвалася, што насценгазета «За мичуринскую биологию» у перадавым артыкуле (№ 5) беспадстаўна абвінаваціла двух студэнтак у мяшчанстве і кар'ерызме.

Рэдкалегія газеты «За мичуринскую биологию» у апошнім нумары прызнала крытыку, накіраваную ў яе адрас, правільнай.

**В. а. рэдактара І. ХАЎРАТОВІЧ.**

АТ 05330 Мінск, друкарня Выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна. Заказ 328